Год выдання другі.

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

№ 44 (113)
ПЯТНІЦА
23
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

Доблесным байцам, камандзірам і палітработнікам у дзень XXII гадавіны Чырвонай Арміі палкае прывітанне!

Слаўная гадавіна

Вялікая Совецкая краіна святкуе сёння слаўную XXII гадавіну Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Совецкі народ ганарыцца тым, што яму ўдалося пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, па ўказанню Леніна і Сталіна стварыць першую ў свеце Чырвоную Армію, якая ў найвялікшых баях адстаяла і адстойвае заваяванні Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі.

Чырвоная Армія—гэта армія вызваленых рабочых і сялян, „яна з'яўляецца зброяй сцвярджэння дыктатуры пролетарыята, зброяй вызвалення рабочых і сялян ад іга памешчыкаў і капіталістаў. Наша Армія ёсць армія вызвалення працоўных." (Сталін).

У гэтых словах таварыша Сталіна геніяльна паказана сутнасць нашай Чырвонай Арміі, яе прынцыпіяльнае адрозненне ад армій капіталістычных краін. Чырвоная Армія — любімае дзецішча, верны страж заваяванняў соцыялізма.

XXII гадавіна Чырвонай Арміі гэта не толькі свята многа мільённага народа нашай радзімы, але і працоўных мас усяго свету, бо Чырвоная Армія, прасякнутая духам інтэрнацыяналізма, нясе на сваіх баявых сцягах свабоду і шчасце прыгнечаным масам капіталістычных краін.

Працоўныя заходніх абласцей Беларусі на сваім вопыце бачаць інтэрнацыянальную ролю Чырвонай Арміі. Калі ў гістарычны дзень 17 верасня 1939 года глава Совецкага ўрада таварыш Молатаў апавясціў аб тым, што совецкі народ працягвае руку брацкай дапамогі адзінакроўным братам заходнім беларусам і заходнім украінцам—і ўзяў пад сваю абарону іх жыццё і маёмасць, то выкананне гэтай задачы было ўскладзена на гераічную Чырвоную Армію.

З іменем вялікага правадыра на вуснах, з баявымі лозунгамі: „За Сталіна!" „За партыю!" „За радзіму!" доблесныя воіны грамілі белапольскіх гора-ваяк і не шкадавалі сваёй крыві і нават жыцця для вызвалення працоўных ад ярма польскіх капіталістаў і памешчыкаў.

Вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну ўвойдзе ў гісторыю чалавецтва, як адна з самых выдатных старонак.

У аперацыях па вызваленню працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны Чырвоная Армія бліскуча прадэманстравала ўсю сваю магутнасць і тэхніку. Яна з такой быстрынёй і сілай абрушылася на сваіх ворагаў, што яны не спраўляліся нават уцякаць.

Чырвоная Армія мае першакласную тэхніку і самае магутнае ў свеце ўзбраенне. Яна атрымала ўсё гэта ў рэзультаце перамогі Сталінскіх пяцігодак і бурнага росквіту прамысловасці ў СССР.

Усе памятаюць, з якім захапленнем народныя масы заходніх абласцей Беларусі сустракалі совецкія танкі і самалёты, артылерыю і мотамеханізаваныя часці, з якім лікаваннем вызвалены народ сустракаў доблесных воінаў краіны соцыялізма.

Выдатная і непераможная тэхніка Чырвонай Арміі, але яшчэ выдатней яе людзі. Сыны народа да апошняй кроплі крыві, да апошняга ўздыхання адданы сваёй радзіме — вось хто з'яўляецца воінам Чырвонай Арміі.

У байца Чырвонай Арміі, у кожнага камандзіра і палітработніка няма другіх інтарэсаў, апрача інтарэсаў народа, працоўных мас.

Чырвоная Армія — самая гуманная і культурная армія ў свеце. Байцы і камандзіры праводзяць вялікую культурна-асветную работу ў сваіх уласных радах і сярод грамадзянскага насельніцтва. Чырвонаармеец, камандзір, палітработнік—гэта самыя перадавыя, культурныя людзі нашага грамадства.

Днямі ў беластоцкім Доме Чырвонай Арміі адбыўся агляд чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці. На аглядзе былі прадэманстраваны незвычайныя таланты чырвонаармейцаў ва ўсіх галінах мастацтва. Гэты агляд бліскуча падцвярджае, што Чырвоная Армія — гэта не толькі школа мужнасці і баявой адвагі, але і выдатная школа вялікай культуры.

Зараз доблесныя часці Чырвонай Арміі змагаюцца за вызваленне фінскага народа ад бандыцка-белагвардзейскай зграі Манергейма—Танера. Апошнія аператыўныя зводкі з фронта гавораць аб слаўных перамогах Чырвонай Арміі, не ведаючай ніякіх парашкод. Не далёка той час, калі фінскі народ разагне сваю спіну, уздыхне свабодна і назаўсёды будзе вызвален ад крывавых забойцаў Манергейма-Танера і іх гаспадароў—англа-французскіх падпальшчыкаў вайны.

Чырвоная Армія і на гэты раз выканае сваю вялікую вызваленчую місію. Пажадаем ёй новых поспехаў і бліскучых перамог!

Няхай жыве наша вызваліцельніца — Чырвоная Армія, Армія рабочых і сялян!

Няхай жыве першы маршал Совецкага Саюза тов. Варашылаў!

Няхай жыве арганізатар і натхніцель усіх перамог Чырвонай Арміі вялікі Сталін!


——«о»——

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 21 лютага на фронце не адбылося нічога істотнага.

З 19 па 21 лютага нашымі войскамі занята па фронту, у тым ліку ў раёне крэпасці Койвісто, 176 абарончых умацаваных пунктаў праціўніка, з іх 37 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванняў.

Наша авіяцыя вяла актыўныя баявыя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У адбыўшыхся паветраных баях збіта 16 самалётаў праціўніка.



РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНЫХ СОВЕТАЎ СССР І БССР

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЛОМЖЫНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 599

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР

Ігаева Сямёна Сцяпанавіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 61 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 60 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» зарэгістраваць для балатыроўкі па Ломжынскай выбарчай акрузе № 599 выстаўленую агульным сходам інтэлігенцыі горада Ломжы, выбаршчыкамі Драздоўскага сельсовета, работнікамі дзяржустаноў гор. Ломжы, рабочымі і служачымі электрастанцыі, на якіх прысутнічала 1500 чалавек, і сходамі іншых арганізацый, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 200 чалавек, кандыдатуру тав. Ігаева Сямёна Сцяпанасіча, 1904 года нараджэння, члена КП(б)Б, першага сакратара Беластоцкага абкома КП(б)Б, пражываючага ў гор. Беластоку.

На падставе арт. 66 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» уключыць кандыдатуру тав. Ігаева Сямёна Сцяпанавіча ў выбарчы бюлетэнь па Ломжынскай выбарчай акрузе № 599 па выбарах у Совет Саюза.

У адпаведнасці з арт. 65 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Совет Саюза ЗАЛАТУХІН,
Намеснік старшыні ВЫРВАС,
Сакратар камісіі ДЫНКІНА,
Члены: ВАСІЛЕЎСКІ,
КАВАЛЁЎ

Гор. Ломжа, 21 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ СОВЕЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 354

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па совецкай выбарчай акрузе № 354 вылучаную агульнымі сходамі настаўнікаў г. Беластока і калектыва служачых аблвыканкома, на якіх прысутнічала 797 чалавек, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 460 чалавек, кандыдатуру тав. Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча, 1894 года нараджэння, пражываючага ў гор. Беластоку, Беластоцкай вобласці, настаўніка, беспартыйнага.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Машэвіцкага Абрама Гешэлевіча ў выбарчы бюлетэнь па Совецкай выбарчай акрузе № 354.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР ДЫБОЎСКІ,
Намеснік старшыні выбарчай камісіі ДЗ'ЯЧУК,
Сакратар камісіі МАЗУРЭНКА,
Члены камісіі: АЛЬШЭЎСКІ, ГРОДЗЕНСКАЯ, ПЕТРАЛЮК, ЗІМНОХ, КЛЕЙНМАН.

Гор. Беласток, 21 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЗАМБРАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 336

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Мазалеўскай Ольгі Кірылаўны

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, акруговая выбарчая камісія, устанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» зарэгістраваць для балатыроўкі па Замбраўскай выбарчай акрузе № 336 вылучаную агульным сходам грамадзян вёсак Вдзеньконь І, Вдзеньконь ІІ, Лясковец-Старая, Краево-Бяла, Фашэ, Воля-Замбраўска—Воля-Замбраўскага сельсовета, на якіх прысутнічала 463 чалавекі, падтрыманую агульным сходам грамадзян вёсак Гжымалы і Вандолкі, на якім прысутнічала 107 чалавек, сходам сялян вёскі Вандолкі-Старае і Вучкі, на якім прысутнічала 51 чалавек, і сходам працоўных гор. Замброва, на якім прысутнічала 700 чалавек, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 400 чалавек, кандыдатуру тав. Мазалеўскай Ольгі Кірылаўны, 1902 г. нараджэння, беспартыйную, сялянку-беднячку, пражываючую ў вёсцы Вдзеньконь І, Замбраўскага раёна.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Мазалеўскай О. К. ў выбарчы бюлетэнь па Замбраўскай выбарчай акрузе № 336.

У адпаведнасці з арт. 56 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» пастанову надрукаваць для ўсеагульнага ведама.

Старшыня акруговай камісіі ЧЭРНОЎ,
Намеснік старшыні МАЛІНОЎСКІ,
Сакратар камісіі МЯДЗВЕДЗЕЎ,
Члены: САСНОВІЧ, ВІШНЕЎСКАЯ, ГАЛАШЭЎСКІ.

Гор. Замброва, 20 лютага 1940 г.

СЛАВА ГЕРОЯМ ЛЕНИНГРАДСКОГО ВОЕННОГО ОКРУГА, БОРЮЩИМСЯ ЗА ОСВОБОЖДЕНИЕ ФИНЛЯНДСКОГО НАРОДА!



Указом Президиума Верховного Совета Союза ССР воентехнику 2-го ранга И. И. Ковалю за образцовое выполнение боевых заданий Командования на фронте борьбы с финской белогвардейщиной и проявленные при этом отвагу и геройство присвоено звание Героя Советского Союза со вручением ордена Ленина и медали «Золотая звезда».

На снимке: Герой Советского Союза воентехник 2-го ранга И. И. КОВАЛЬ.

Фото-клише ТАСС.

ЛЕНИН И СТАЛИН—ОРГАНИЗАТОРЫ И СТРОИТЕЛИ КРАСНОЙ АРМИИ

Бессмертной славой овеяны знамена непобедимой Красной Армии. Героические подвиги наших бойцов, командиров и политработников широко известны всему миру.

Грозную силу оружия Красной Армии испытали на себе белогвардейцы и интервенты в первые годы создания советской власти. Это оружие стало разить еще более метко в последующие годы, когда нашим красноармейским частям, вооруженным по последнему слову военной техники, приходилось у Хасана, на Халхин-Голе давать отпор японским самураям, пытавшимся прощупать наши силы. Сила Красной Армии была продемонстрирована совсем недавно, при освобождении наших единокровных братьев в Западной Украине и Западной Белоруссии от панского гнета; она демонстрируется и сейчас, когда Красная Армия, оказывающая помощь финскому народу, беспощадно громит белофинские банды.

Своей неотразимой мощью Красная Армия прежде всего обязана тому, что создавали ее и строили гениальные революционные вожди Ленин и Сталин.

Для Ленина и Сталина с первых же дней Октябрьской социалистической революции было ясно, что без вооруженных сил социализма советской власти будет угрожать смертельная опасность, ибо капиталистический мир, ненавидящий власть рабочих и крестьян, придет на помощь внутренней контрреволюции.

Вот почему партия Ленина—Сталина с первых же дней существования Советской республики приступила к организации новой, революционной армии.

В годы гражданской войны Ленин и Сталин сами осуществляли высшее руководство борьбой Красной Армии против интервентов и белогвардейцев.

Совместная работа Ленина и Сталина представляла собой образец великого содружества, взаимопонимания, единства мысли и действий. Принимая то или иное решение, Ленин советуется со Сталиным, учитывает его замечания и поправки. Будучи в курсе боевой обстановки на всех фронтах, Ленин и Сталин отдавали распоряжения главному, фронтовому, армейскому командованию. С утра, приступая к работе, Владимир Ильич раньше всего внимательно изучал оперативные донесения, после чего рассылал телеграммы, вызывал то или иное лицо по прямому проводу, чтобы передать срочную директиву.

В критические моменты, когда фронту грозит катастрофа, Ленин посылает товарища Сталина, чтобы выправить положение. В Царицыне, на Восточном фронте, при обороне Петрограда от банд Юденича, в разгроме «добровольческой» армии Деникина, на врангелевском фронте—всюду товарищ Сталин, выполняя ответственнейшие поручения партии, добивался победы над врагами.

Поднимая красноармейские части на борьбу с белогвардейщиной, повышая их боеспособность, товарищ Сталин в то же время создавал все новые и новые войсковые соединения, способные отразить любой напор противника. Именно в те напряженные годы была создана доблестная Первая Конная армия, одно имя которой приводило в трепет неприятеля.

Товарищу Сталину приходилось руководить боевыми операциями в условиях, когда предатель Троцкий и его сподручные всячески пытались мешать нашим успехам, сорвать их. Но эти попытки провалились благодаря бдительности товарища Сталина, беспощадно громившего подлых троцкистов, врагов народа.

Гениальное руководство Ленина и Сталина привело нашу страну к победе над белогвардейцами и интервентами. Советский народ получил возможность заняться мирным, созидательным трудом.

После смерти Владимира Ильича вождь народов товарищ Сталин, давший у гроба Ленина клятву крепить мощь Красной Армии и Военно-Морского Флота, продолжает неустанно заботиться о вооруженных силах социалистического государства. Он вникает во все мелочи, дает ценнейшие указания, которые непрерывно улучшают вооружение наших частей.

Встречаясь с работниками Красной Армии, товарищ Сталин часто задает им такие вопросы, которые свидетельствуют о его глубоком знании военного дела. И всегда—будь это на заседании Главного Военного Совета, членом которого товарищ Сталин состоит, или на других специальных совещаниях, или в частной беседе с командирами — на первом плане у нашего великого вождя, учителя и друга забота о безопасности страны, а следовательно, об усилении Красной Армии и Военно-Морского Флота.

Товарищ Сталин вникает во все детали вооружения армии, флота, авиации, он заботится о нашей пехоте, об артиллерии, авиации, морском флоте, танковых и инженерных частях. Бойцы и командиры всех видов вооруженных сил нашего государства знают и чувствуют постоянную заботу товарища Сталина.

Сталинские пятилетки, поднявшие индустриализацию нашей страны на небывалую высоту, позволили снабдить Красную Армию таким совершенным вооружением и техникой, которые превратили ее в самую мощную армию в мире. Наши люди, которым страна доверила оружие, воспитаны партией Ленина—Сталина в духе безграничной преданности народу.

Вспомним имена Героев Советского Союза товарищей Штерна, Кравченко, Смушкевича, Мошляка и других. Их героизм и отвага известны всему миру!

Командиры и бойцы Красной Армии свою преданность родине доказали и продолжают доказывать на всех участках, куда их направляет командование. Сталинские соколы, отважные пехотинцы, артиллеристы, танкисты, связисты, краснофлотцы—вся Красная Армия и Военно-Морской Флот непроницаемой стеной стоят на защите страны социализма.

Этим мы обязаны Ленину и Сталину, под чьим гениальным руководством Красная Армия и Военно-Морской Флот создавались, росли, крепли и сейчас представляют собой могучую силу, страшную для врагов нашей социалистической родины.

Герой Советского Союза
Д. ЛЕВЧЕНКО



И. В. Сталин (1920 г.)



Указом Президиума Верховного Совета Союза ССР капитану Н. Г. Саранчеву за образцовое выполнение боевых заданий Командования на фронте борьбы с финской белогвардейщиной и проявленные при этом отвагу и геройство присвоено звание Героя Советского Союза со вручением ордена Ленина и медали «Золотая Звезда».

На снимке: Герой Советского Союза Н. Г. Саранчев.

Фото-Клише ТАСС.

СЛАВА НАШИМ ДОБЛЕСТНЫМ БОЙЦАМ И КОМАНДИРАМ!

СЛАВА ГЕРОЯМ БОРЬБЫ С БЕЛОФИННАМИ!

«ЗА СТАЛИНА! ЗА РОДИНУ!»

На батарею, которой командует Герой Советского Союза тов. Маргулис, напала банда белофиннов, численностью свыше 300 человек. Командир батареи не растерялся и принял решение — отбить атаку и уничтожить банду.

50 белофиннов атаковали батарею в лоб, около 60 зашли с тыла и до 200 наседали с флангов.

Тов. Маргулис оставил у пушек по два человека с приказом: расстреливаь бандитов в упор! Остальные наши бойцы во главе с командиром повели оборону с флангов и тыла.

Бесчисленные атаки белофиннов не имели успеха. Противник был деморализован упорством и стойкостью красных артиллеристов, расстреливавших бандитов в упор из пушек, пулеметов, винтовок.

Вскоре герой Маргулис повел бойцов в наступление. С возгласами «За Сталина! За родину!» они пошли в атаку. Банда, испугавшись штыкового удара, в панике бежала. На поле боя остались десятки убитых белофиннов.

ЗОРКИЙ РАЗВЕДЧИК

Боец Грушин находился в разведке. Он внимательно осматривал местность. Внезапно зоркий глаз отважного разведчика заметил, что белофинн, сидящий на дереве, прицелился в находящегося неподалеку батальонного комиссара.

Моментально Грушин вскинул винтовку и метким выстрелом снял с дерева белофинскую «кукушку».

Комиссар крепко пожал руку бдительному бойцу, спасшему его жизнь.

СЛАВА НАШИМ ДОБЛЕСТНЫМ БОЙЦАМ И КОМАНДИРАМ!

СЛАВА ГЕРОЯМ БОРЬБЫ С БЕЛОФИННАМИ!

ГЕРОЙ - ТРАКТОРИСТ

Отряд белофиннов напал на роту, охранявшую командный пункт. В это время поблизости проезжал на своем тракторе водитель Койда. Он вез боеприпасы и пищу бойцам.

Шквальным огнем автоматов уже был скошен пулеметный расчет. Увидев это, Койда соскочил с трактора и бросился к пулемету. Еще мгновение — и по наступающему противнику ударила горячая пулеметная струя. Койда бил уверенно и метко, белофинны падали один за другим, густо устилая снег своими трупами. Их атака захлебнулась как раз в тот момент, когда Койда израсходовал последний патрон.

Но это была только первая атака. Опомнившись от полученного удара, шюцкоровцы снова ринулись вперед. Койда не растерялся и на этот раз.

Вскочив снова на трактор, он на большой скорости повел его на врага, врезавшись в самую гущу наступавших. Он сшибал их корпусом машины, давил гусеницами, расстреливал из [illegible]чного пулемета. Увлеченные его порывом, красноармейцы ударили в штыки и опрокинули банду. Бросая убитых и раненых, белофинны в панике бежали.

Президиум Верховного Совета СССР присвоил тов. Койде звание Героя Советского Союза.

ОДИН ПРОТИВ ПЯТИ

Артиллерист тов. Харитонов в бою остался один у своего орудия, но все же не бросил его. Когда белофинны подошли близко, тов. Харитонов, израсходовав все патроны, топором уничтожил пять человек, с честью выполнив боевую задачу, и сам остался жив.

Н. ОСИПОВ, Н. ШИММЕЛЬ

Армия освобождения народов

Новая империалистическая война, неизбежность которой неоднократно предсказывали Ленин и Сталин, уже полыхает и душит в своих кровавых об'ятиях около одной трети населения земного шара. Начатая грабительским нападением империалистов на Абиссинию, Испанию и Китай, новая империалистическая война уже переросла в схватку между крупнейшими государствами Европы. Методами запугивания и провокаций, шантажа и обмана англо-французские поджигатели войны и их пособники из лагеря II интернационала стараются превратить вторую империалистическую войну в новую мировую бойню, они хотят втянуть в омут войны все человечество.

Как и все империалистические войны, новая война является несправедливой, захватнической. Она продолжает политику борьбы империалистических держав за мировое господство — за колонии, источники сырья, продолжает политику удушения и ограбления других стран, порабощения других народов.

Империалистическую войну нельзя кончить росчерком пера. Чтобы прекратить эту войну, нужна мужественная и непримиримая борьба против нее, против ее поджигателей и виновников, надо уничтожить коренные причины и условия, порождающие империалистические войны. Причины войн заложены в самой сущности классового общества, в разделении людей на эксплоататоров и эксплоатируемых.

Война —явление классовое, она неизбежно связана с существованием и борьбой классов. Поэтому нельзя уничтожить войны, не уничтожив капитализм.

Великая Октябрьская социалистическая революция вырвала народы нашей страны из капиталистического рабства и ужасов империалистической войны. Но, пока наша страна находится в капиталистическом окружении, неизбежны военные провокации, контрреволюционные войны, диверсии против страны социализма со стороны империалистических государств. Большевистская партия, Ленин и Сталин всегда уделяли исключительное внимание вооруженным силам революции, создавали и укрепляли эти силы, учили партию овладевать военным делом.

Еще в период первой русской революции молодой Сталин, выступая перед рабочими Тифлиса, говорил:

«Что нужно, чтобы действительно победить? Для этого нужны три вещи: первое, что нам нужно, — вооружение, второе — вооружение, третье— еще и еще раз вооружение. (Л. Берия — «К вопросу об истории большевистских организаций в Закавказье», изд. 38 г. стр. 84). В том же 1905 году Ленин писал:

«Возьмите военное дело. Ни один социал-демократ, знакомый хоть сколько-нибудь с историей, учившийся у великого знатока этого дела, Энгельса, не сомневался никогда в громадном значении военных знаний, в громадной важности военной техники и военной организации, как орудия, которым пользуются массы народа и классы народа для решения великих исторических столкновений». (Соч., т. VII, стр. 384—385).

В условиях новой эпохи Ленин и Сталин развили дальше учение Маркса и Энгельса о вооруженном восстании, о войне и армии. В боевых организациях нашей партии под руководством Ленина и Сталина воспитались такие полководцы нового типа, как Ворошилов, Фрунзе, Киров, Куйбышев, Орджоникидзе. Ленин и Сталин создали Красную гвардию. Они являются вождями и организаторами вооруженных сил социалистического государства, непревзойденными полководцами и стратегами пролетарской революции. Под руководством Ленина и Сталина наша партия создала армию нового типа — Красную Армию, подняла народ на справедливую, освободительную войну против контрреволюции и империализма.

Величественен и славен героический путь Красной Армии. Первый этап этого пути окутан пороховым дымом гражданской войны 1918 — 1921 годов. Империалисты четырнадцати стран организовывали против молодой Советской республики поход за походом. Регулярные армии интервентов и белогвардейцев были вооружены новейшей по тому времени техникой, прекрасно обмундированы и снабжены продовольствием. Ими руководили опытные военные специалисты.

Красная Армия сражалась против этих врагов полураздетая и полуголодная, плохо вооруженная, с очень ограниченным запасом боеприпасов. Ее командиры росли одновременно с организацией красных частей, учились военному делу в боях.

И все же в сотнях жесточайших боев руководимая Лениным и Сталиным Красная Армия разгромила врагов Советской страны, вышла победительницей из четырехлетней гражданской войны.

Закончилась гражданская война. Советский народ приступил к мирному хозяйственному строительству. Упрочение Советской власти вызвало еще большую ненависть к ней со стороны империалистов Запада и Востока. Исходя злобой, они стали готовить новую войну. Началась бешеная гонка вооружений капиталистических стран. В те дни Ленин указывал:

«...Мы говорим себе: взявшись за наше мирное строительство, мы приложим все силы, чтобы его продолжать беспрерывно. В то же время, товарищи, будьте на - чеку, берегите обороноспособность нашей страны и нашей Красной Армии, как зеницу ока...» (Соч., т. XXVII стр. 120).

Вооружение Красной Армии требовало ремонта, замены, модернизации. Коренные изменения нужно было внести в организацию вооруженных сил страны. Начался второй этап в жизни Красной Армии — период ее реорганизации, известной под названием «военной реформы», которая была проведена под руководством лучших боевых соратников И. В. Сталина — товарищами Фрунзе и Ворошиловым. Народы Советского Союза, руководимые большевистской партией, создали новый военный аппарат, укрепили новую армию рабочих и крестьян. Эта новая армия — плоть от плоти и кость от кости советского народа, живое воплощение идей диктатуры рабочего класса.

В январе 1924 года умер Ленин. Все заботы об укреплении обороноспособности страны, о превращении Красной Армии в армию передовую, первоклассную, сильнейшую в мире взял на себя верный ученик и соратник Ленина товарищ Сталин. У гроба любимого Ильича товарищ Сталин дал великую клятву высоко нести знамя ленинизма, с честью выполнить ленинские заветы.

«Третьей основой диктатуры пролетариата,—говорил товарищ Сталин,— является наша Красная армия, наш Красный флот. Ленин не раз говорил нам, что передышка, отвоеванная нами у капиталистических государств, может оказаться кратковременной. Ленин не раз указывал нам, что укрепление Красной армии и улучшение ее состояния является одной из важнейших задач нашей партии... Поклянемся же, товарищи, что мы не пощадим сил для того, чтобы укрепить нашу Красную армию, наш Красный флот».

Сталинская клятва была клятвой всей партии, всего советского народа, поставившего перед собой историческую задачу создания армии мировой революции. И народ под руководством партии Ленина - Сталина, не жалея сил, неуклонно выполнял и выполняет эту клятву.

Красная Армия росла и крепла каждодневно. Наступил третий этап в ее жизни, совпавший с выполнением сталинских пятилеток. Созданная за годы сталинских пятилеток мощная социалистическая индустрия дала Красной Армии новейшую военную технику. Партия воспитала преданные делу коммунизма высококвалифицированные кадры бойцов, политработников и командиров, в совершенстве овладевших техникой. Партия большевиков очистила Красную Армию от просочившихся в ее ряды троцкистско - бухаринских, гамарнико - булинских и иных предателей - шпионов иностранных разведок. Это еще более укрепило мощь Красной Армии. Армия советского народа стала непобедимой, сильнейшей в мире.

Только один ворошиловский залп стрелкового корпуса нашей армии может обрушить на врага 78.932 килограмма разящего металла! Наши самолеты, управляемые сталинскими соколами, неуязвимы. Они летают со скоростью, далеко перевалившей за 500 клм. в час; они поднимаются выше, чем на 15.000 метров! Искусный маневр, выдержка, стремительный натиск, штыковой удар красной пехоты губительны для врага. Наша конница совершает марши по 100 километров в сутки! Качество советских танков и подвиги советских танкистов достаточно известны всему миру. Не останется безоружной наша армия и в химической войне.

Красная Армия — первая армия в мире, призванная до конца отстоять свободу трудящихся. Свою несокрушимую мощь и готовность к выполнению своих задач она показала в блестящих победах над врагами. Первый предметный урок получили кичливые японские самураи у озера Хасан. Этого урока самураям оказалось недостаточно. Что-ж? Красная Армия повторила этот урок у реки Халхин-Гол в еще более убедительной форме. Если понадобится, урок будет повторен еще раз.

В сентябре 1939 года наша армия дала новый пример своей мощи и высокой боеспособности в этот раз на полях бывшей панской Польши. 13 миллионов наших единокровных братьев — западных украинцев и западных

Няхай жыве наша вызваліцельніца—гераічная Чырвоная Армія!

СВАЁ СЛОВА ЯНЫ СТРЫМАЛІ!

Было гэта ў сераду, 21 верасня, вечарам. На канцы Варшаўскай вуліцы сабраліся натоўпы людзей. Вочы іх упіваліся ў цемру, у бялеючую істужку дарогі. Адтуль, з боку Баранавіцкага шассе, павінны былі прысці чырвоныя часці.

Чакалі мы разам з мужам да позняй ночы, але ў той вечар ніхто не прышоў. 22 верасня ў горадзе сталі збірацца людзі. Ішлі яны не разрознена, а стройнымі калонамі, з чырвонымі істужкамі, з кветкамі ў руках, ішлі і спявалі «Інтэрнацыянал».

І раптам усе спыніліся. Здалёку імчалася машына-грузавік. Яна затрымалася. Народу стаўпілася столькі, што нельга было прасунуцца ўперад. На грузавіку—7 ці 9 чырвонаармейцаў. Усе яны маладыя, стройныя і прыгожа апранутыя. Раздалося магутнае «ўра», «Няхай жывуць нашы вызваліцелі!». З усіх бакоў пасыпаліся на нашых чырвонаармейцаў кветкі і букеты. Работніца нашай фабрыкі Гута Окунь падала ім шакалад. Яны ўсміхнуліся і сардэчна падзякавалі.

Пад вечар у горад ішла пяхота. Ішлі палкі за палкамі без канца. Якая сіла! Якая арганізаванасць! І ўспомніла я 1920 год, калі ў нас, у беларускай вёсцы Калодна каля Баранавіч паявілася Чырвоная Армія, як мы іх прымалі і частавалі ў хаце майго бацькі. Яны былі нашы родныя, блізкія. Але якая розніца! Якой магутнай і культурнай стала краіна Саветаў.

Выцягнуліся твары ў эндэкаў і азонаўцаў. Яны гаварылі, што чырвоныя прышлі толькі на тры дні. А калі паявіліся вялікія танкі,—яны змоўклі і пайшлі з тратуараў. Усю ноч мы стаялі каля акна і ўглядаліся ў праходзячыя міма нас войскі.

28 год я працую на фабрыцы і ўвесь час гэтага чакала. Памятую, што калі чырвоныя байцы адыходзілі ў 1920 годзе, яны абяцалі, што прыдуць зноў. Сваё слова яны стрымалі!

Марыя Лаўрэнцьеўна Крыгер, сельфактарчыца 2-га тэкст-камбіната.

МАЯ ПЕРШАЯ СУСТРЭЧА

Не памятую дакладна чысла, памятую толькі, што была яркая, сонечная верасьнёўская раніца. Усё насельніцтва нашай вёскі Плюцічы рыхтавалася да сустрэчы Чырвонай Арміі. Малявалі лозунгі, упрыгожвалі дамы, рабілі сцягі, вязалі букеты.

Наступіла доўгачаканая гадзіна. Па-святочнаму апранутыя, з кветкамі ў руках і з чырвонымі банцікамі на грудзях, мы ўсёй вёскай з песнямі, з лозунгамі вышлі насустрач чырвонаармейскім часцям.

Размясціліся на горцы і чакалі, углядаючыся ўдалечыню і пільна прыслухоўваючыся. Нарэшце, паказаліся з-за лесу браніраваныя машыны. Мы кінуліся з звонкім крыкам ім насустрач. Яны ішлі павольна па напрамку з Беластока на Бельск. Параўняўшыся з намі, убачыўшы арку, упрыгожаную кветкамі, убачыўшы нас, яны спыніліся.

Усе мы крычалі ім словы прывітання. Усе кідалі ім кветкі, прыносілі прадукты свайго вырабу. Многія жанчыны плакалі.

Чырвонаармейцы ўсміхаліся, паціскалі працягнутыя ім рукі, цалаваліся і былі глыбока ўсхваляваны. Дзяцей, стаяўшых блізка ля машыны, падымалі ўверх і ўсаджвалі сярод кветак.

Я ніколі не забуду гэтага дня. Я яго чакаў з такой нецярплівасцю, мне так хацелася паглядзець хоць-бы на аднаго савецкага чалавека. А яны былі такія простыя, родныя.

Чырвонаармейцы сталі нашымі пастаяннымі гасцямі. Яны наладжвалі ў нас вечары з духавым аркестрам, гармошкай, прывозілі кінопераcоўку, наладжвалі чыткі газет, гутаркі, сходы, арганізавалі гурток па ліквідацыі непісьменнасці. Вёска зажыла новым жыццём. Мы таксама хадзілі да іх у сядзібу ў госці. Нашы старыя, якія ніколі не ведалі і не чулі нічога аб кіно, хадзілі глядзець карціны «Чапаев», «Крестьяне», «Щорс» і інш.

Жыццё з таго дня змянілася карэнным чынам.

Я беларус. Мне вельмі хацелася вучыцца, але ў панскай Польшчы гэта было немагчыма. Цяпер гэта мара ператварылася ў сапраўднасць. Я вучуся ў савецкай школе. Жыву ў чыстым і цёплым інтэрнаце.

Цяпер я маю ўсе правы савецкага грамадзяніна. Я шчаслівы і ўдзячан партыі, ураду і Чырвонай Арміі за сваё вызваленне.

Дзмітрук Іван
вучань 14 школы гор. Беластока



ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ — ЛЕПШЫ ДРУГ ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СВЕТУ

30 жніўня — за два дні перад пачаткам польска-германскай вайны,—я быў мабілізаван і адпраўлен у Ліду.

Польская армія была разгромлена з такой быстрынёй, што мой полк не справіўся нават удзельнічаць у ваенных дзеяннях.

Мы ўцяклі, і 15 верасня наш полк аказаўся ў Львове. Рота, у якой я служыў, стаяла на Лычакове (прадмесце Львова). Там мы першы раз сустрэліся з савецкімі танкамі. Польскі афіцэр, камандуючы маёй ротай, аддаў загад страляць па савецкіх танках з вінтовак (другога аружжа ў нас не было).

Большасць салдат не выканала гэтага дурацкага загада. Некалькі чалавек аднак-жа стрэлілі з вінтовак. Мы ўсе былі ўпэўнены, што ў адказ на гэта савецкія танкі адкрыюць па нас агонь і ўсіх нас знішчаць. Якое вялікае было наша здзіўленне, калі мы ўбачылі, што танкі адкрылі агонь... уверх.

Тады мы ўсе, нават найбольш несвядомыя з нас, зразумелі, што перад намі знаходзіцца не вораг, а друг і вызваліцель.

Мы кінулі аружжа і рашылі звяртацца дамоў да нашых сем'яў.

Дзесяткі тысяч польскіх салдат без аружжа ішлі тады па дарогах Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі: насустрач нам рушыліся магутныя савецкія танкі, ішла савецкая пяхота, ехала кавалерыя.

— Няхай жыве Чырвоная Армія! Няхай жыве Савецкі ўрад! Няхай жыве таварыш Сталін!—не змаўкалі нашы прывітанні.

